ПАЧУЦЦЁ СЯМ'І АДЗІНАЙ

СУСТРАКАЮЧЫ 60-ГОДДЗЕ ЎТВАРЭННЯ СССР, САВЕЦКІ НАРОД ПА ПРАВУ ГАНАРЫЦЦА СВАІМІ ДАСЯГНЕННЯМІ, ТОЙ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ МІСІЯЙ, ЯКУЮ З ГОНАРАМ ВЫКОНВАЕ НАША РАДЗІМА, ШТО ІДЗЕ Ў ПЕРШЫХ РАДАХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА МІР, НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ, СВАБОДУ І ШЧАСЦЕ НАРОДАЎ.

З пастановы ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».



І. Я. ПАЛЯКОЎ,
Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, Герой Сацыялістычнай Працы

«РАБОЧЫЯ І СЯЛЯНЕ БЕЛАРУСІ ПАСТАНАВІЛІ...»

Пачну з аднаго дакумента нашай гісторыі. У «Звароце да беларусаў», прынятым па даручэнню канферэнцыі беларускіх секцый пры ЦК РКП(б), адзначалася:

«Рабоча-сялянская Савецкая Расія падае нам руку для супольнага братэрскага жыцця, прызнае нашы правы быць вольным народам і, як роўнаму з роўным, крочыць па вялікім шляху сацыялізму. Хутчэй жа ў дарогу, браты-беларусы! Але толькі з Савецкай Расіяй. На яе Чырвоным сцягу лунае заклік да пралетарскай еднасці...»

Працоўныя масы Беларусі, што скінулі дзякуючы Вялікаму Кастрычніку кайданы сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, усім сэрцам успрынялі гэты гарачы заклік камуністаў крочыць шляхам сацыялізму разам са сваім старэйшым братам — вялікім рускім народам. У студзені 1921 года паміж РСФСР і Беларускай ССР быў падпісаны саюзны рабоча-сялянскі дагавор, паводле якога абедзве савецкія рэспублікі ўступалі ў ваенны і гаспадарчы саюз, што будаваўся на пачатках поўнага раўнапраўя і суверэннасці. Гэты дагавор адыграў вялікую ролю ва ўмацаванні рэвалюцыйных заваёў нашага народа, пашырэнні і паглыбленні эканамічнага супрацоўніцтва рэспублік.

З бескарыслівай дапамогай рускага рабочага класа і працоўнага сялянства маладая Савецкая Беларусь змагла ў кароткія тэрміны стаць на ногі, пакончыць са цяжкімі вынікамі дзвюх войнаў — першай сусветнай і грамадзянскай. Саўнарком РСФСР па ініцыятыве У. І. Леніна асігнаваў буйныя грашовыя сродкі для аднаўлення вытворчых сіл нашай рэспублікі. Уладзімір Ільіч уважліва ставіўся да яе запатрабаванняў. «Солі, жалеза і ўсяго, каб засеяць усю зямлю. Трэба даць...» — можна прачытаць у ягоных нататках паводле выступлення беларускага селяніна — дэлегата VIII Усерасійскага з'езда Саветаў. Увесну 1921 года Саўнарком РСФСР выдзеліў Беларусі каля паловы мільёна пудоў насення, дапамог сельскагаспадарчымі машынамі і інвентаром, коньмі, мінеральнымі ўгнаеннямі. Дапамагалі нам таксама працоўныя Украіны, Закаўказзя. Як з братамі дзялілася з імі ўсім, чым магла, і Беларусь.

Вопыт першых гадоў Савецкай улады пераканаўча засведчыў, што карэнны інтарэс працоўных усіх нацыянальнасцей краіны — стварыць саюзную дзяржаву з адзінаю гаспадарчаю, знешняю, абароннаю палітыкаю, заснаванай на даверы і добраахвотнай згодзе ўсіх рэспублік, якія аб'ядноўваюцца. Ідэя У. І. Леніна аб стварэнні такога саюзу сустрэла аднадушную падтрымку ўсіх народаў былой царскай Расіі.

«Усебеларускі з'езд Саветаў,— занатавала ў сваёй рэзалюцыі канферэнцыя рабочых і служачых Мінска, што адбылася 10 снежня 1922 года,— павінен прыняць рашэнні, якія б зрабілі яшчэ больш моцнаю сувязь усіх савецкіх рэспублік, гарантавалі адзінства не толькі ўнутранага гаспадарчага будаўніцтва і абароны краіны, але таксама і адзінства знешняй палітыкі, захоўваючы ў той жа час уплыў кожнай савецкай рэспублікі на справы ўсяго Саюза Савецкіх Рэспублік».

Падобныя рэзалюцыі прымаліся паўсюдна. Выступаючы на X Усерасійскім з'ездзе Саветаў, Старшыня ЦВК і СНК БССР А. Р. Чарвякоў заявіў: «...рабочыя і сяляне Беларусі ў асобе IV Усебеларускага з'езда Саветаў аднагалосна прынялі пастанову ўвайсці ў першы Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік... Працоўныя Беларусі будуць ганарыцца, калі Вы прымеце нашу прапанову». Так разам з Расійскай Федэрацыяй, Украінскай ССР і Закаўказскай Федэрацыяй Беларуская ССР увайшла ў склад саюзнай Савецкай дзяржавы, што вызначыла новы, вышэйшы этап у развіцці дзяржаўнасці нашай рэспублікі. Умацоўваўся яе суверэнітэт, які гарантаваўся цяпер палітычнай, эканамічнай і ваеннай магутнасцю ўсяго Савецкага Саюза. Узніклі спрыяльныя ўмовы для ўсебаковага развіцця эканомікі і культуры рэспублікі, для поўнага росквіту беларускай нацыі як нацыі сацыялістычнай.

Камуністычная партыя зрабіла асноўным пунктам сваёй нацыянальнай палітыкі хутчэйшае пераадоленне эканамічнай і культурнай адсталасці раней прыгнечаных народаў. Што ж уяўляла сабой Беларусь дарэвалюцыйная? Яе прамысловасць у разліку на душу насельніцтва давала прадукцыі амаль у 2,5 раза меней у параўнанні са сярэднерасійскімі паказчыкамі. Яе сялянская гаспадарка трымалася на прымітыўных прыладах вытворчасці — сасе і драўлянай баране, сярпе і касе. Чатыры пятыя яе насельніцтва было непісьменным. Самабытная культура беларусаў знаходзілася ў заняпадзе, родная беларуская мова — забаранялася. За цэлае стагоддзе, што папярэднічала 1917 году, на беларускай мове было выдадзена ўсяго толькі 320 назваў кніг.

Прыгадаем, з якім душэўным болем пісаў пра тыя часіны Якуб Колас: «У маіх вачах да гэтай пары стаяць вузенькія, разнашэрсныя палікі сялянскай зямлі. Я бачу жахлівыя, суровыя ў сваёй панурлівай прастаце прыдарожныя крыжы, крыжы пры ўваходзе і выхадзе з паселішчаў. Яны нібыта падкрэслівалі сабою той невыказны боль, што выпаў на долю нашага народа».

Пасля грамадзянскай вайны і без таго слабая эканоміка Беларусі прыйшла ў поўны занядад. Сапраўды вялікі подзвіг патрабаваўся здзейсніць, каб не толькі аднавіць народную гаспадарку, але і забяспечыць рух наперад па рэйках сацыялізму эканомікі, культуры і ўсяго жыцця нашага народа. Сілы для гэтага знайшліся дзякуючы савецкаму ладу, аб'яднанню рэсурсаў братніх рэспублік, кіраўніцтву Камуністычнай партыі.

Характэрная дэталь: у год утварэння Саюза ССР была створана першая ў гісторыі Беларусі навукова-даследчая ўстанова — Інстытут беларускай культуры, ці, як яго скарочана называлі, Інбелкульт, што стаў папярэднікам Акадэміі навук БССР. Годам раней у рэспубліцы адкрылася першая ВНУ — Белдзяржуніверсітэт і першая навукова-тэхнічная ўстанова — Беларускі дзяржаўны палітэхнікум. У тыя ж гады ў Мінску пачалі працаваць Першы Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр, першая Беларуская дзяржаўная бібліятэка...

Амаль усё, што тады стваралася, было першым.

У. І. Ленін вучыў: каб пабудаваць савецкую гаспадарку, патрэбна велізарнае павышэнне культуры. Вось чаму нават у самыя цяжкія гады савецкія людзі не шкадавалі сіл і сродкаў на школы, тэхнікумы, ВНУ, тэатры, выдавецкую справу. Шырокім фронтам ішоў наступ на невуцтва, у масавым парадку ствараліся ячэйкі таварыства «Прэч непісьменнасць!», лікбез ахапіў сотні тысяч дарослых людзей. Ужо ў 1930 годзе пісьменнымі былі чатыры пятыя насельніцтва рэспублікі.

Толькі адукаваны народ мог узяцца і хуткімі тэмпамі правесці індустрыялізацыю, сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі. На Беларусі за гады даваенных пяцігодак было пабудавана 1700 прамысловых прадпрыемстваў, створана энергетычная база, з'явіліся такія галіны, як станкабудаванне, маторабудаванне, сельскагаспадарчае машынабудаванне, вытворчасць радыёапаратуры, цэменту, штучнага валакна. Калектывізацыя дала магчымасць стварыць буйную механізаваную сельскагаспадарчую вытворчасць.

Усе гэтыя здабыткі — плён аб'яднаных, сумесных намаганняў не толькі працоўных нашай рэспублікі, але і ўсяе краіны. Славутыя ў тыя гады Турксіб, Магнітка, Днепрагэс, Сталінградскі трактарны і шмат якія іншыя будоўлі згуртоўвалі народы нашай Радзімы, умацоўвалі іх братэрскія сувязі. Тысячы і тысячы беларусаў па закліку партыі, па абавязку сваіх сэрцаў ехалі ва ўсе куткі краіны, каб прыняць удзел у стварэнні індустрыяльнага падмурка сацыялізму. А да нас, у Беларусь, адусюль прыбывалі кваліфікаваныя кадры, каб даванне і станкабудаванне, хімія і нафтахімія, радыётэхніка і электроніка, лёгкая і харчовая прамысловасць. Беларусь дае большую частку савецкіх звышмагутных аўтасамазвалаў, сіласаўборачных і кармаўборачных камбайнаў, звыш паловы калійных угнаенняў, якія здабываюцца ў краіне, кожны шосты трактар і сёмы металарэзны станок, 22 працэнты хімічных валокнаў і нітак, 20 працэнтаў наручных гадзіннікаў, кожны пяты матацыкл і каля 15 працэнтаў веласіпедаў. Шмат якія вырабы з беларускаю маркаю карыстаюцца шырокім попытам на сусветным рынку. Флагман беларускай энергетыкі — Лукомская ДРЭС выпрацоўвае амаль у трыццаць разоў больш электраэнергіі, чым усе электрастанцыі рэспублікі ў 1940 годзе, а ўся прамысловасць Беларусі за дваццаць дзён дае сёння столькі ж прадукцыі, колькі мелі за перадваенны год. Прамысловы патэнцыял рэспублікі за апошнія два дзесяцігоддзі падвойваўся практычна кожныя сем гадоў.

Але ж ці маглі б мы, беларусы, дасягнуць гэтых вышынь уласнымі сіламі і сродкамі? Беларусь, каб вырабляць усё тое, што яна дае сёння народнай гаспадарцы краіны, атрымлівае з іншых раёнаў Савецкага Саюза каменны вугаль і кокс, нафту і газ, чорныя і каляровыя металы, бавоўну і воўну, лесаматэрыялы і харчовую сыравіну — усяго і не пералічыць. Плён сваёй працы шлюць нам цюменскія і бакінскія нафтавікі, запарожскія металургі і данецкія шахцёры, ленінградскія турбабудаўнікі, казахстанскія земляробы — уся краіна. У сваю чаргу Беларусь, у адпаведнасці з агульнасаюзным размеркаваннем працы, вырабляе тое, што патрэбна ўсёй краіне.

Савецкія рэспублікі абменьваюцца кадрамі, вытворчым вопытам, творчымі дасягненнямі вынікамі навуковых даследаванняў. Сотні прадпрыемстваў, праектных арганізацый Масквы, Ленінграда, Кіева, Новасібірска, шмат якіх ін-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

сённяшні воблік рэспублікі, але ж і яны красамоўна сведчаць аб тым, што дала беларускаму народу ленінская нацыянальная палітыка КПСС, братняя дружба і ўзаемадапамога савецкіх народаў. Толькі ў саюзе рэспублік, толькі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, толькі агульнымі намаганнямі мы змаглі пакончыць з эканамічнай і культурнай адсталасцю, адолець фашысцкую навалу і тым захаваць сябе як вольную нацыю, у кароткі тэрмін аднавіць разбураную вайной народную гаспадарку, навуку, дасягнуць велізарных сацыяльных заваёў. Кожны беларус, кожны працаўнік нашай рэспублікі глыбока ўсведамляе гэта не толькі розумам, але і сэрцам.

Канечне, далёка не ўсё ў нас добра, не ўсе справы ідуць гладка. Мы, савецкія людзі, глядзім на рэчы рэальна, бачым і недахопы, хібы, нявырашаныя праблемы. Над вырашэннем шэрагу вельмі важных, надзённых пытанняў вядзецца цяпер карпатлівая, мэтаскіраваная работа, прыкладаюцца ўсе сілы, каб паспяхова выканаць планы адзінаццатай пяцігодкі, рашэнні XXVI з'езда КПСС.

Працаўнікі прамысловасці рэспублікі нарошчваюць тэмпы вытворчасці галоўным чынам за кошт больш эфектыўнага выкарыстання існуючых магутнасцей, тэхнічнага пераўзбраення, укаранення прагрэсіўных тэхналогій. Як сведчаць папярэднія вынікі, яны паспяхова выконваюць планавыя заданні другога года адзінаццатай пяцігодкі і сацыялістычныя абавязацельствы, узятыя ў гонар 60-годдзя ўтварэння Саюза ССР.

Выконваючы гістарычныя рашэнні XXVI з'езда партыі, майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, працаўнікі сельскай гаспадаркі рэспублікі імкнуцца памножыць свой уклад у ажыццяўленне Харчовай праграмы краіны. Вырашаецца задача: павялічыць сярэднегадавую вытворчасць збожжа на 26—31 працэнт, павысіць зборы бульбы, цукровых буракоў і іншых сельскагаспадарчых культур. Узяты курс на максімальнае павелічэнне надояў малака ад кожнай каровы, прывагу жывёлы на адкорме. У рэспубліцы ствараюцца новыя комплексы па вырошчванню і адкорму буйной рагатай жывёлы, свіней, ажыццяўляюцца важныя арганізацыйна-гаспадарчыя мерапрыемствы, якія ахопліваюць пытанні планавання, кіравання, укаранення навуковых дасягненняў і новай тэхнікі, падрыхтоўкі спецыялістаў, а таксама пытанні жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ў вёсцы.

Шасцідзесяцігадовая гісторыя Саюза ССР — гэта і гісторыя ўсенароднага развіцця савецкай дэмакратыі. Ад Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў да Саветаў дэпутатаў працоўных, а потым — да Саветаў народных дэпутатаў — такі слаўны шлях пройдзен органамі народнай улады першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы. Новая Канстытуцыя СССР і Канстытуцыя Беларускай ССР значна ўмацавалі статус усяе сістэмы органаў улады, пашырылі іх правы. Магутным творчым зарадам для наступнай актывізацыі дзейнасці Саветаў усіх звенняў сталі рашэнні XXVI партыйнага з'езда.

Саветы рэспублікі, пачынаючы ад Вярхоўнага і канчаючы пасялковымі і сельскімі, аб'ядноўваюць 85.883 дэпутаты. Гэта па-сапраўднаму прадстаўнічыя органы народаўладдзя. Сярод дэпутатаў мясцовых Саветаў рэспублікі дзве трэція часткі складаюць рабочыя і калгаснікі, амаль палову — жанчыны, кожны пяты дэпутат — камсамолец. У органы ўлады абраны прадстаўнікі 39 розных нацыянальнасцей. У полі зроку і Вярхоўнага Савета рэспублікі, і мясцовых органаў улады знаходзяцца вузлавыя праблемы, звязаныя з рэалізацыяй заданняў пяцігодкі, выкананнем Харчовай праграмы,— максімальнае выкарыстанне магчымасцей для павелічэння вытворчасці і паляпшэння якасці тавараў народнага ужытку, удасканаленне абслугоўвання насельніцтва, выкананне планаў будаўніцтва жылля, школ, клубаў, бальніц і гэтак далей. Вырашаючы такое шырокае кола задач, Саветы ўсё актыўней умешваюцца ў жыццё, настойліва ўдасканальваюць сваю шматгранную дзейнасць.

Рабочыя і сяляне Беларусі, як і ўсе працоўныя нашай краіны, якія аднагалосна вырашылі ўвайсці ў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, ганарацца тым, што збыліся іх самыя смелыя мары, апраўдаліся самыя высокія надзеі.

Слава Беларусі.

Фотаэцюд Ю. ІВАНОВА.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ